Пралетарыі ўсіх краін, єднайцеся!

# ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 67 (136)
ПЯТНІЦА
22
САКАВІКА
1940 г.

Цана 10 капеек

***Паслязаўтра вызвалены народ будзе выбіраць сваіх дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР***

*„Хто імкнецца да таго, каб працоўныя СССР карысталіся і надалей дабротамі мірнай працы, хто хоча свабоды і незалежнасці нашай радзімы, той будзе галасаваць за партыю большэвікоў, той будзе галасаваць за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных“.*

*(Са звароту ЦК КП(б)Б).*

## УЗМАЦНІЦЬ АГІТАЦЫЮ, ЗАКОНЧЫЦЬ АРГАНІЗАЦЫЙНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ВЫБАРАЎ

Прайшло амаль два месяцы з пачатку выбарчай кампаніі. За гэты перыяд партыйныя арганізацыі, не гледзячы на іх маладосць, у радзе раёнаў нашай вобласці сумелі праваліць велізарную работу па свайму размаху і палітычнаму значэнню. Партыйныя арганізацыі сумесна з беспартыйнымі рабочымі, сялянамі, інтэлігенцыяй вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР самых дастойных людзей вызваленага народа. Гэтыя кандыдаты з'яўляюцца агульнымі як для комуністаў, так і для беспартыйных. Комуністы будуць аднадушна галасаваць за беспартыйных кандыдатаў, роўна як беспартыйныя выбаршчыкі будуць аднадушна галасаваць за кандыдатаў — членаў партыі. Блок комуністаў і беспартыйных — гэта сіла, аб якую разаб'юцца ўсялякія прошукі астаткаў польскіх паноў, якія асмеляцца памяшаць паспяховаму завяршэнню выбарчай кампаніі.

Велізарны вынік выбарчай кампаніі — гэта далучэнне да актыўнага грамадска-палітычнага жыцця дзесяткаў тысяч людзей. Увесь выбарчы актыў, тысячы агітатараў, якія так страсна выступалі на сходах і мітынгах за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, — усе яны ў сваёй абсалютнай большасці — мясцовыя людзі, паднятыя да актыўнай грамадскай дзейнасці партыйнымі арганізацыямі. З ліку гэтых людзей, праявіўшых сябе ў падрыхтоўцы да выбараў, партыйныя совецкія і іншыя арганізацыі будуць чэрпаць кадры для совецкіх, профсаюзных, гаспадарчых і іншых арганізацый.

Да выбараў асталося ўсяго два дні. У гэтыя дні трэба яшчэ больш узмацніць агітацыйную работу, яшчэ і яшчэ раз расказаць выбаршчыкам жыццёвы шлях кандыдатаў, за якіх яны будуць галасаваць, наладжваць сустрэчы кандыдатаў з выбаршчыкамі. Не абмяжоўваючыся сходамі, мітынгамі, заняткамі ў гуртках, трэба наведваць выбаршчыкаў на іх кватэрах, расказваць ім аб кандыдатах, аб парадку галасавання, аб формах бюлетэняў для галасавання асобна за кандыдатаў у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР, асобна за кандыдатаў у Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР і асобна за кандыдатаў у Вярхоўны Совет БССР. Нельга недаацэньваць гэтую тэхнічную, на першы погляд справу, але маючую вялікае значэнне.

Яшчэ і яшчэ раз трэба праверыць спіскі выбаршчыкаў. Не можа быць ніводнага выбаршчыка, які не быў-бы занесен у спіскі. Не можа астацца ніводнае скажэнне імя ці прозвішча выбаршчыка. На жаль, у радзе месц рашылі, што спіскамі выбаршчыкаў ужо не варта займацца, што гэта, моў, пройдзены этап. У гарадскім пасёлку Заблудаве, напрыклад, не ўнесены ў спіскі маладыя выбаршчыкі, якім да дня выбараў спаўняецца 18 год. Многа пераблытаных прозвішчаў, некаторым грамадзянам напісалі год нараджэння 1090, 1960 і т. д. Можна толькі здзіўляцца бестурботнасцю пасялковага камітэта і яго старшыні тав. Перальгута да такой важнейшай справы. Маса пагрэшнасцей маецца ў спісках і іншых выбарчых участкаў. Усё гэта можна і неабходна выправіць неадкладна.

Большасць выбарчых участкаў ужо гатова да сустрэчы выбаршчыкаў. Пабудаваны кабіны, маюцца ўрны, памяшканні любоўна ўпрыгожаны партрэтамі правадыроў, лозунгамі, плакатамі і біяграфіямі кандыдатаў, якія тут будуць балатыравацца. Гэтыя ўчасткі штодзённа наведваюць сотні людзей, знаёмячыся з распалажэннем комнат, кабін, уваходу і выхаду, каб не губляць часу, не стварыць чаргі і штурханіны выканаць свой грамадзянскі доўг у дзень выбараў. Але не ўсюды так абстаіць справа. На рдзе участкаў кабіны яшчэ не гатовы і не абсталяваны. Выбаршчык, зайшоўшы, напрыклад, на 32 участак г. Беластока, не зможа сабе ўявіць, якім парадкам будзе арганізавана галасаванне і прыём бюлетэняў на гэтым участку. Усё гэта адкладваецца чамусьці на самы апошні дзень.

Не на ўсіх участках улічана колькасць выбаршчыкаў, якія па раду прычын не змогуць 24 сакавіка з'явіцца на выбарчыя ўчасткі, як, напрыклад, перастарэлыя, лёгка хворыя і т. д. Гэтыя людзі не могуць быць пазбаўлены сваіх велізарнейшых правоў галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Участковыя камісіі павінны паклапаціцца, каб да лёгка хворых прышлі члены камісіі з урнамі і прынялі ад іх бюлетэні, ствараючы дома абстаноўку для тайнага галасавання. Для перастарэлых трэба арганізаваць падвозку іх на машынах, на фурманках да выбарчых участкаў. Асабліва гэта важна ў вёсках, дзе многія ўчасткі размешчаны ад месца жыхарства некаторых выбаршчыкаў на вялікай адлеглас-ці.

Дзень выбараў—гэта велізарнае гістарычнае свята ў жыцці народаў заходніх абласцей. Трэба стварыць на ўчастках такую абстаноўку, якая-б адпавядала гэтаму святу. Артысты, музыканты, танцоры, дэкламатары, гурткі мастацкай самадзейнасці — усе на выбарчыя ўчасткі! Няхай радасць і вясёлле напоўніць сэрца кожнага выбаршчыка. Няхай лікуе свабодны народ, які ўпяршыню ў сваім жыцці на аснове самай дэмакратычнай Сталінскай Канстытуцыі выбірае сваіх прадстаўнікоў у вышэйшыя органы ўлады.

——«о»——

## АБВЯРЖЭННЕ ТАСС

У замежным друку паведамляецца, што паміж Фінляндыяй, Швецыяй і Нарвегіяй быццам-бы вядуцца перагаворы аб заключэнні так званага „абарончага саюза“ з задачамі ваеннай аховы граніц Фінляндыі. Пры гэтым паведамляецца, што быццам-бы Совецкі Саюз не супярэчыць супроць такога „абарончага саюза“ паміж Фінляндыяй, Швецыяй і Нарвегіяй.

ТАСС упаўнаважан заявіць, што гэтыя паведамленні наконт пазіцыі Совецкага Саюза не адказваюць сапраўднасці, бо, як гэта відаць з вядомай антысовецкай прамовы старшыні нарвежскага стортынга п. Хамбро ад 14 сакавіка, падобны саюз быў-бы накіраван супроць СССР і знаходзіўся-б у прамым супярэчанні з Мірным Дагаворам, заключаным СССР і Фінляндыяй 12 сакавіка г. г.

ДЗІМІТРЫЙ ГЕОРГІЕВІЧ ДУБРОЎСКІ,
кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 347

ФРАНЦ ІВАНАВІЧ МАЧУЛЬСКІ,
кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 341

## Радасная сустрэча

**Ленінград**, 20 сакавіка. (ТАСС). Велізарная плошча ля Фінляндскага вакзала запруджана радасна ажыўленымі людзьмі. Усюды раюць сцягі дэлегацый, якія прышлі сюды сустракаць байцоў - лыжнікаў, самааддана змагаўшыхся на Карэльскім перашыйку. „Палкае прывітанне героям!“ — гараць лозунгі.

Роўна ў 4 гадзіны 30 мінут да платформы Фінляндскага вакзала падыходзіць поезд. З вагонаў выходзяць байцылыжнікі ў шэрых шлемах і курткох.

Сотні рук працягваюць кветкі героям, якія пакрылі сябе неўвядаемай славай у баях за радзіму, за безпаспасць горада Леніна. Разда юцца прывітальныя воклічы, крыкі „ура“.

Тысячы ленінградцаў запоўнілі тратуары залітых сонцам вуліц. Бесперапынна грымяць прывітанні ў чэсць геройчай Чырвонай Арміі, якая надзейна закрыла подступы да вялікага горада.

На вуліцы Халтурына шэсце астанавілася. Адкрываецца мітынг.

Байцоў - лыжнікаў вітаюць сакратар гарадскога камітэта ВКП(б) тав. Маханаў, токар Кіраўскага завода тав. Пілатаў, сакратар партыйнага бюро фабрыкі „Пролетарская перамога“ № 1 — тав. Дворан.

Слова прадастаўляецца чырвонаармейцу - лыжніку тав. Власану.

— Дарагія таварышы, — гаворыць ён, — мы з гордасцю можам рапартаваць працоўным Ленінграда і ўсёй краіне аб выкананні свайго задання. Цёплая сустрэча, якую сёння вы аказалі нам, лепш усякіх слоў гаворыць аб тым, як любіць народ сваю доблесную Чырвоную Армію. У глыбокіх снягах Карэльскага перашыйку, у паходзе, на адпачынку, мы чытаючы вашы пісьмы, атрымоўваючы вашы падарункі, адчувалі, што з намі ўвесь многамільённы совецкі народ.

## СУСТРЭЧЫ КАНДЫДАТАЎ З ВЫБАРШЧЫКАМІ

### *Сустрэча з тав. Цанава*

Зал Беластоцкага Дома партыйнай асветы запоўнілі выбаршчыкі Цэнтральнай выбарчай акругі № 353. Яны прышлі на сустрэчу са сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Лаўрэнціем Фамічом Цанава. З'явілася больш 800 чалавек.

У сваёй прамове тав. Цанава гаварыў аб дружбе народаў многанацыянальнага Совецкага Саюза, аб задачах соцыялістычнага будаўніцтва ў заходніх абласцях Беларусі. Тав. Цанава заклікаў усіх выбаршчыкаў быць пільнымі.

— Астаткі разгромленых ворагаў, — сказаў ён, — будуць імкнуцца пашкодзіць працоўным, чым толькі змогуць. Для сваіх падрыўных мэт яны будуць скарыстоўваць усе магчымасці. Патрэбна быць пільнымі, умець заўсёды разгледзець ворага, як-бы ён ні маскіраваўся, і своечасова выкрыць яго махінацыі.

Я ад усяго сэрца дзякую вам, выбаршчыкі, за аказанае мне давер'е і запэўняю, што прыму самы актыўны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве заходніх абласцей Беларусі. Я не пашкадую сіл, каб апраўдаць давер'е выбаршчыкаў, давер'е народа. Давер'е народа—гэта вялікая справа, і ўсе мы павінны яго шанаваць і апраўдваць.

Заканчэнне прамовы тав. Цанава пакрылася бурнымі апладысментамі і прывітальнымі воклічамі ў чэсць генія чалавецтва таварыша Сталіна.

Двухстаночнік 29 тэкстыльнай фабрыкі тав. Беластоцкі ў сваім выступленні гаварыў:

— 24 сакавіка — гэта дзень вялікага свята для ўсіх працоўных. Мы будзем выбіраць сапраўдных сваіх прадстаўнікоў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Рабочыя многіх прадпрыемстваў абавязаліся сустрэць гэты дзень вытворчымі перамогамі. Наш калектыў абавязаўся выканаць вытворчы план першага квартала да 24 сакавіка. Гэтае абавязацельства мы выканалі датэрмінова і да канца месяца будзем даваць нашай радзіме звышпланавую прадукцыю. Мы з радасцю аддадзім свае галасы ў дзень выбараў за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

З гарачай прамовай выступіў рабочы 24-й тэкстыльнай фабрыкі тав. Фукс. Ён заклікаў выбаршчыкаў арганізавана з'явіцца 24 сакавіка на ўчасткі і аддаць свае галасы за вылучаных народам кандыдатаў.

Выбаршчыкі Цэнтральнай акругі вельмі цёпла сустрэлі выступленне тав. Турлейскага — кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР па Беластоцкай выбарчай акрузе. Яго гарачая прамова неаднаразова перарывалася бурнымі апладысментамі і прывітальнымі воклічамі ў чэсць совецкай улады, комуністычнай партыі і вялікага Сталіна.

Сход пад доўга незмаўкаючыя апладысменты прыняў прывітальную тэлеграму правадыру народаў Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.

### *СУСТРЭЧА З ТАВ. БОЛТРЫКАМ*

У гор. Свіслач адбылася сустрэча выбаршчыкаў з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Нікалаем Нікалаевічам Болтрыкам. На сустрэчы прысутнічала 700 чалавек. Выступіўшыя выбаршчыкі тт. Сідранская, Курбат і інш. ахарактарызавалі тав. Болтрыка, як вернага сына працоўнага народа і звярнуліся да ўсіх прысутных з заклікам аддаць за яго свае галасы.

Выступіўшы затым з прамовай кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Н. Н. Болтрык заявіў:

— Панская Польшча была турмой народаў. Замест школ, дамоў культуры і т. д. паны будавалі турмы і канцэнтрацыйныя лагеры, у якія саджалі лепшых рабочых і сялян. Памешчыкі, фабрыканты, ксяндзы, папы і іншыя крывапіўцы высмоктвалі з працоўных усё, што маглі.

Былая Польшча — турма народаў — сцёрта з твару зямлі. Рабоча - Сялянская Чырвоная Армія па загаду Совецкага ўраду і комуністычнай партыі назаўсёды вызваліла нас ад панскага гнёту. Над намі назаўсёды вастаржаствавалі чырвоны сцяг.

Жыццё працоўных Заходняй Беларусі пры совецкай уладзе хутка паляпшаецца. Сяляне Беластоцкай вобласці атрымалі 200 тысяч гектараў зямлі. У абласці адкрыта 183 новых школы, арганізавана некалькі дзесяткаў дзіцячых садоў, бальніц. Дзесяткі тысяч беспрацоўных атрымалі работу. Усё гэта дала совецкая ўлада вызваленым працоўным за такі кароткі час.

Выбаршчыкі 381-й акругі аказалі мне вялікае давер'е, вылучыўшы кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Я, як сын працоўнага народа, прыкладу ўсе свае сілы, усе здольнасці для таго, каб з чэсцю апраўдаць давер'е народа.

Няхай жыве правадыр і настаўнік працоўных усяго свету таварыш Сталін!

Апошнія словы тав. Болтрыка былі пакрыты бурнымі апладысментамі.

## У ЧЭСЦЬ ВЫБАРАЎ

### ВЫКАНАЛІ КВАРТАЛЬНЫ ПЛАН

Рыхтуючыся дастойна сустрэць дзень выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, беластоцкая абцасавая фабрыка датэрмінова (20 сакавіка) выканала свой квартальны план.

**Гасілоўскі,**
дырэктар фабрыкі.

### ЧЫРВОНЫ АБОЗ У ЧЭСЦЬ ВЫБАРАЎ

**Гродна.** (Па тэлефону). У чэсць выбараў сяляне вёскі Баранава, Гродненскага раёна, арганізавалі чырвоны абоз з хлебам. У ім прыняла ўдзел 50 гаспадарак, якія прадалі дзяржаве 10 тон хлеба.

# ВЫБАРШЧЫКІ АБМЯРКОЎВАЮЦЬ ЗВАРОТ ЦК КП(б)Б

## Мы шчаслівы, што жывём у Совецкай краіне

У актавы зал Беластоцкага педагагічнага інстытута сабраліся рабочыя 6-га тэкстыльнага камбіната, студэнты педвучылішча, выбаршчыкі 81-га і 82-га выбарчых участкаў.

Прысутныя ўважліва слухалі старшага палітрука тав. Шамко, які зачытаў зварот ЦК КП(б)Б да ўсіх выбаршчыкаў. Гістарычны дакумент выклікаў вялікі ўздым ў сабраўшыхся. Пасля заканчэння чыткі ў зале раздаліся бурныя апладысменты і прывітальныя воклічы ў чэсць правадыра народаў таварыша Сталіна.

Рабочы тэкстыльнага камбіната тав. Кучановіч у сваім выступленні гаварыў аб тым, што совецкая ўлада ўцягнула ў актыўнае грамадскае жыццё тысячы раней прыгнечаных і бяспраўных людзей.

— Мы шчаслівы, —заканчвае ён, — і гардзімся тым, што жывём у такой краіне. Я заклікаю ўсіх выбаршчыкаў галасаваць за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, за шчаслівае жыццё, за вялікую дружбу народаў.

Тав. Пшыбыляк гаварыў аб тым, што польская ўлада сілком прымушала працоўных галасаваць за паноў патоцкіх, любамірскіх і іншых, якія нічога агульнага з працоўным народам не мелі.

Сход праходзіў пры вялікім уздыме прысутных. Пасля схода дэманстравалася кіно-карціна. Н-ская часць прыслала на сход музыкантаў, і моладзь весела правяла вольны час.

**Т. Лысенка.**

## БУДЗЕМ ГАЛАСАВАЦЬ ЗА ШЧАСЛІВАЕ ЖЫЦЦЁ

**Скідзель.** (Па тэлефону). 20 лютага ў скідзельскім раённым клубе сабраўся многалюдны мітынг, прысвечаны звароту ЦК КП(б)Б да ўсіх выбаршчыкаў. На мітынгу прысутнічала 500 чалавек.

Рабочы скурзавода тав. Баран у сваёй прамове заявіў:

— Працоўныя заходніх абласцей Беларусі з вялікім задавальненнем сустрэлі зварот ЦК КП(б) Б. Яны вітаюць партыю большэвікоў, якая выступае на выбарах у блоку з беспартыйнымі. У дзень выбараў мы усе, як адзін, з'явімся на выбарчыя ўчасткі і будзем галасаваць за кандыдатаў народа, за совецкую ўладу, за партыю большэвікоў і таварыша Сталіна, якія далі нам радаснае і шчаслівае жыццё, вызвалілі ад векавога прыгнёту і нацыянальнай няроўнасці.

——«о»——

### ПЕРАДВЫБАРЧАЯ ХРОНІКА

У мястэчку Руткі, Замброўскага раёна, у дні падрыхтоўкі да выбараў вырас вялікі актыў з ліку сялян і мясцовай інтэлігенцыі. 60 чалавек з'яўляюцца агітатарамі. Яны праводзяць агітацыю за кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР, арганізуюць вывучэнне Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. Лепшымі агітатарамі ў Руткоўскай выбарчай акрузе № 337 з'яўляюцца тт. Дзвінскі, Рабіновіч і іншыя.

**І. Гаршкоў.**

Піонеры школы № 32 г. Беластока рыхтуюцца да выбараў, як да вялікага свята. Яны дапамагаюць работнікам выбарчага ўчастка ва ўпрыгожванні памяшкання: малююць і развешваюць лозунгі і плакаты. Днямі піонеры арганізавалі для выбаршчыкаў вечар самадзейнасці.

**Ф. Карока.**

Комсамольская арганізацыя г. Ломжы і раёна прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да выбараў. Агітатарамі працуюць 67 комсамольцаў і несаюзнай моладзі, членамі акруговых і ўчастковых камісій—78 чалавек, даверанымі—20 чалавек і т. д. У апошнія перадвыбарчыя дні комсамольцы і моладзь шырока разгарнулі агітацыю за кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР. Маладыя агітатары тт. Мышляк, Бацлаўская і іншыя для правядзення перадвыбарчай агітацыі выехалі ў вёскі.

**Г. Дынькіна.**

Учора адбылося пасяджэнне Беластоцкай акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР. Члены камісіі дэтальна азнаёміліся з парадкам запаўнення выбарчых дакументаў і размеркавалі абавязкі на дзень выбараў.

**А. Данькін.**

# ПРАДСВЯТОЧНЫ БЕЛАСТОК

24 сакавіка... На кожнай вуліцы з мноства макетаў календара гэтыя словы напамінаюць, агітуюць, хвалююць, напаўняюць сэрцы прадчуваннем чагосьці небывалага, бязмежна вялікага і радаснага.

Выбары ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР — гэта не проста кампанія, гэта не проста чарговае свята, гэта паваротны момант у жыцці новых грамадзян нашай радзімы. Выбары ўскалыхнулі самыя гушчы народных мас, паднялі іх да палітычнага жыцця, да ўзроўню дзяржаўных дзеячоў.

Вось чаму так людна вечарамі на вуліцах прадсвяточнага Беластока. Людзям не сядзіцца ў хаце, ім хочацца гутарыць, выясняць незразумелае, дзяліцца сваімі меркаваннямі, выказваць свой настрой і свае пачуцці.

Вось глухая рабочая ўскраіна Беласточак. Пры панах яна лічылася вёскай. Вузкая, крывая вуліца. Маленькія драўляныя хаткі. Зараз новае жыццё прышло на вуліцу Беласточак. Перадвыбарчае дыханне адчуваецца тут не менш чым у цэнтры горада. Дамы ўпрыгожаны. На дамах — партрэты любімых правадыроў, чырвоныя палотнішчы, сцягі, лозунгі, плакаты, транспаранты, пано.

Напружаныя дні наступілі для членаў выбарчых камісій. На ўчастках заканчваюцца апошнія прыгатаванні, ідзе агітацыя за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

У лепшым будынку па вуліцы Беласточак размясціўся 58 выбарчы ўчастак Пролетарскай акругі. Брама апавіта ў чырвоны кумач. Над уваходам — „Добро пожаловать, товарищи избиратели". Утульнае ўбранне пакояў участка песціць вока выбаршчыка. На беларускай, рускай і польскай мовах напісаны падрабязныя біяграфіі кандыдатаў — Кавалёва, Турлейскага, Пятроўскай. Насценгазета дае рад выказванняў выбаршчыкаў аб сваіх кандыдатах. На сценах мноства плакатаў і памастацку выкананых лозунгаў Вечарамі тут збіраюцца выбаршчыкі, каб пачытаць літаратуру і газеты, пагутарыць, выясніць цікавячыя пытанні. У асобным пакоі абсталявана 8 кабін. Участак гатоў да сустрэчы выбаршчыкаў.

Заўсёды многа наведвальнікаў на 59 участку. Вось заходзяць дзяўчаты Ірэна Дзеніс і Тамара Бароўская. У другі раз яны праглядаюць спіс выбаршчыкаў, каб яшчэ раз упэўніцца, што іх прозвішчы запісаны.

— Нам проста не верыцца, гавораць яны, што мы, 18-гадовыя дзяўчаты, будзем прымаць удзел у выбарах вярхоўных органаў улады.

Падрыхтоўчая работа кіпіць на 21 участку. Абсталёўваюцца кабіны, канчаткова ўдакладняюцца спіскі выбаршчыкаў. Служачая дэпо агітатар. С. М. Кірылава ўнесла ў журнал адзінаццаты запіс. На сваім участку яна закончыла вывучэнне Сталінскай Канстытуцыі, Палажэння аб выбарах, расказала біяграфіі кандыдатаў.

На 67 участку развешваюцца гірлянды ў пакоі, дзе будзе праходзіць галасаванне. Сёння і заўтра тут будуць сходы выбаршчыкаў, пасля якіх дзяржфілармонія дасць канцэрты. 27 агітатараў вядуць тут агітацыю за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Участкі—гэта цэнтры ўсёй перадвыбарчай работы. Але не толькі на ўчастках адчуваецца прыбліжэнне выбараў.

Працягнем наша падарожжа па прадсвяточнаму гораду. Цэнтральная Совецкая вуліца. На ўсім працягу яна прыняла святочны выгляд. Вялікі партрэт таварыша Сталіна ўстаноўлен на плошчы ў цэнтры горада. Побач — партрэты бліжэйшых саратнікаў правадыра — членаў Палітбюро ЦК ВКП(б). З найвялікшай любоўю аформлены партрэты першых кандыдатаў вызваленага народа. На будынках аблвыканкома, першай гасцініцы, горвыканкома і інш. устаноўлены партрэты таварышоў Сталіна, Молатава, Варашылава, Кагановіча, Калініна, Андрэева, Жданава, Мікаяна, Хрушчова, Берыя і Шверніка.

Каля дома Чырвонай Арміі—вялікае пано „Усе на выбары"!

Як толькі вячэрняя просінь акутае горад, над высокай брамай перад будынкам аблвыканкома загараюцца агністыя літары «24 сакавіка». Яны відаць далёка, сімвалізуючы аб набліжэнні вялікага свята.

Чырвоныя сцягі, лозунгі на палатне і паперы, плакаты і транспаранты...

Ленінская вуліца аформлена на тэму: „Дружба народаў СССР". На будынку супроць кінотэатра „Спартак"—прыгожае пано, на якім красачна паказана, як пад праменнямі сонца Сталінскай Канстытуцыі, пад чырвонымі сцягамі, плячом к плячу, крочаць шматлікія нацыянальнасці вялікага Совецкага Саюза. Пано выдатна перадае садружаства і адзінства народаў краіны соцыялізма.

Па Жаўткоўскаму шасе прыцягвае ўвагу вялікае пано будучага Палаца Советаў. З левага боку на чырвоным палатне вялікімі літарамі напісан артыкул з Сталінскай Канстытуцыі, побач рад лозунгаў, плакатаў, уверсе—герб краіны соцыялізма, а над усім узвышаецца вялікі партрэт таварыша Сталіна.

Прыгожа аформлена Тэатральная плошча. У цэнтры ўстаноўлен абеліск з серпам і молатам, а вакол размясціліся вялікія пано, якія ілюструюць артыкулы Сталінскай Канстытуцыі. Пано красачна перадаюць права працоўных на працу, на адпачынак, роўнапраўе грамадзян СССР, роўнаправе жанчыны ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага, культурнага і грамадска-палітычнага жыцця. Тут-жа паказана абаронная магутнасць соцыялістычнай дзяржавы і рост прамысловасці БССР.

Лозунгі заклікаюць выбаршчыкаў аддаць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных і гэтым самым прагаласаваць за сваё шчаслівае і радаснае жыццё, за далейшы росквіт нашай радзімы.

Горад зіхаціць святочным убраннем. Вячэрняя сінь празіваецца яркімі электрычнымі промнямі, праломленымі ў чырвані кумача.

З глыбіні Ленінскай вуліцы даносіцца меладычная музыка духавога аркестра, які выконвае папулярную совецкую песню „Масква". Музыка нарастае, прыбліжаецца, ёй акампаніруе чоткі, упэўнены шаг. Гэта вайсковая часць з сцягамі і лозунгамі вяртаецца з сустрэчы са сваім кандыдатам тав. Кавалёвым. На тратуарах спыняюцца людзі. Далёка разносіцца песня:

Страна моя, Москва моя
Ты самая любимая.

**Т. Лясовіч.**

**МОРЫС ТОРЭЗ,**
генеральны сакратар ЦК компартыі Францыі

# ТАКІ ЛЕОН БЛЮМ!

«Гэта быў сын разбагацеўшых буржуа, з тых, хто займаюцца арыстакратычнай літаратурай і разыгрываюць патрыцыяў трэцяй рэспублікі. Звалі яго Люсьен Леві-Кёр... Лісліваяя мова, далікатныя манеры, тонкія і мяккія рукі, таяўшыя ў чужой руцэ. Ён заўсёды падкрэсліваў сваю ветлівасць, быў утончана ласкавы... Люсьен Леві-Кёр соцыяліст... Люсьен Леві-Кёр не адзін падточваў соцыялізм. Соцыялістычныя газеты былі поўны гэтымі чалавечышкамі».

У «Ярмарцы на плошчы», пятай кнізе рамана «Жан Крыстоф», Рамэн Ралан майстэрскай рукой намаляваў гэты партрэт соцыялістычнага фарысея. Аўтар пісаў у 1908 годзе; ён пісаў з натуры. Ён добра ведаў натуршчыка — Леона Блюма, свайго таварыша па школе.

### ПАРАСТАК КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ ФІРМЫ

На самай справе, гэты соцыялістычны лідэр нарадзіўся ў сям'і багатага дзяльца-буржуя. Фірма Блюм змяшчаецца ў сэрцы Парыжа, у дзелавым раёне Сантэ, у двух шагах ад біржы, сучаснага храма залатому цяльцу.

Як гэта звычайна бывае ў буржуазных сем'ях, для двух братоў Блюмаў былі прадугледжаны розныя, аднак дапаўняўшыя адзін другога, заняткі. Адзін з іх павінен быў стаяць на чале фірмы; яму было даручана з карысцю кіраваць капіталам сям'і, эксплаатуючы пролетарыяў. Другі (які нас асабліва цікавіць) быў прадназначан ахоўваць інтарэсы фірмы Блюм і другіх капіталістычных прадпрыемстваў, абараняць прывілегіі класа эксплаататараў. Сваёй кар'ерай ён абраў адміністрацыйную дзейнасць і «палітыку». Для ўсякіх Леві-Кёр апошняя з'яўляецца майстэрствам жульнічаць і машэннічаць, ашукваючы рабочы клас, уводзячы яго ў заблуджэнне хлуснёй і прытворствам, дэмаралізуючы яго і адцягваючы ад вызваленчай барацьбы,— карацей сказаць, падтрымліваючы панаванне буржуазіі.

Леон Блюм стаў адвакатам. Ён увайшоў у дзяржаўны совет. Члены гэтага органа, стаячага над парламентам, падбіраюцца з асаблівым разборам; яны сочаць за зместам і формай законаў і дэкрэтаў. Дзяржаўны совет гарантуе дзейнасць выканаўчай улады і дзейнасць дыктатуры капітала, пасылаючы людзей, «ведаючых законы», у міністэрствы і важныя органы кіравання буржуазнай дзяржавы. Такім шляхам Блюм стаў начальнікам кабінета Марселя Сембa, соцыялістычнага міністра ў перыяд першай імперыялістычнай вайны.

У снежні 1920 года кангрэс у Туры пераважнай большасцю галасоў прымае рашэнне аб далучэнні соцыялістычнай партыі да Комуністычнага Інтэрнацыянала, заснаванага Леніным. Леон Блюм бярэ слова ад імені шавіністычнай імперыялістычнай меншасці кангрэса. Яго прамова носіць уласцівы яго выступленням адбітак злобнай казуістыкі і фальшы.

Пасля кангрэса ў Туры мы бачым Леона Блюма на чале соцыялістычнай партыі, а ў далейшым — і рэдактарам яе газеты «Попюлер». Леон Блюм зневажае радавых членаў партыі. Ён ніколі не падтрымліваў сувязі з рабочымі. Яго спецыяльнасць — барацьба супроць апазіцыйных рухаў унутры партыі.

### ЛАНЦУГ ГНУСНЫХ ЗДРАД

Працоўныя Парыжа не скрывалі сваіх пачуццяў да здрадніка Блюма. У 1932 годзе рабочыя 20-й акругі, той, дзе змагаліся і паміралі апошнія комунары, прагналі Блюма з паста дэпутата, выбраўшы на яго месца комуніста Жака Дзюкло, праследуемага і расшукваемага паліцыяй. І Блюм, заўсёды такі асцярожны, траціць галаву. Ён не можа стрымаць сваёй злобы. Ён аблівае граззю працоўных Парыжа і піша: «Комуністычныя кадры павінны быць знішчаны».

Але комунізм ідзе наперад. Расце ўплыў Совецкага Саюза на працоўных капіталістычных краін. Рабочыя, якія пакутуюць ад беспрацоўя, нізкай аплаты працы і ўсемагчымых нястач, бачаць, што ў Совецкім Саюзе няма беспрацоўя. Яны бачаць, што за першым перыядам аднаўлення, накаплення сіл, умацавання ўлады ідзе перыяд незвычайнага ўздыму соцыялістычнага будаўніцтва. Большэвіцкая партыя пад мудрым кіраўніцтвам Сталіна пераможна ажыццяўляе індустрыялізацыю, а затым і калектывізацыю краіны, наперакор супроцьдзеянню апартуністаў — капітулянтаў, якія скаціліся да здрады і найняліся на службу да замежных разведак.

Леон Блюм пачаў подлую кампанію сістэматычнага паклёпу на Совецкі Саюз і яго грандыёзныя дасягненні. Не гледзячы на шматлікія пратэсты соцыялістычных рабочых, газета «Попюлер» ні разу не змясціла ні адзінага станоўчага радка аб Совецкай краіне. Затое яна штодзённа публікавала і прадаўжае публікаваць контррэволюцыйныя выдумкі і самы подлы паклёп на Совецкі Саюз.

На працягу раду год Леон Блюм энергічна змагаўся супроць шматлікіх прапаноў комуністаў устанавіць адзінства дзеянняў з соцыялістамі. Нарэшце, у 1934 годзе Блюм на загалоўнай староцы сваёй газеты прызнаў, што комуністы сваёй нястомнай дзейнасцю зрабілі адзіны фронт «немінучым». Ужо большасць соцыялістычных рабочых устанавіла адзіны фронт з комуністамі. Тады Блюм зрабіў па вядомаму рэцэпту: «Я іх правадыр, значыць я іду за імі». Але ён пайшоў за сваімі войскамі толькі для таго, каб не выпусціць іх з рук.

У маі 1936 года народны фронт, створаны па ініцыятыве комуністаў, дабіўся велізарнага поспеху на выбарах. У якасці лідэра соцыялістычнай партыі — партыі, атрымаўшай найбольшую колькасць месц у парламенце, Леон Блюм стаў прэм'ер-міністрам. На надзвычайным з'ездзе соцыялістычнай партыі 30 мая 1936 года ён сказаў:

— Я не Керэнскі. Калі я ўйду, то спадчына не дастанецца Леніну.

У той момант гэтыя словы Леона Блюма мелі наступнае значэнне: «Мае дарагія сябры - капіталісты, не хвалюйцеся! Я зраблю ўсё, каб зламіць уздым мас. Я зраблю ўсё, каб народны фронт не даў рабочаму класу і народу перамогу, каб нашы прыбыткі не знізіліся і ваша панаванне не пацярпела. Каб пазбегчы магчымасці аказацца ў адзін добры дзень Керэнскім, я буду Носке. Я буду падрыхтоўваць наступленне рэакцыі супроць народнага фронта, супроць рабочага класа, супроць комунізма».

### НА ЯГО РУКАХ КРОЎ ІСПАНІІ

Ужо ў пачатку жніўня Леон Блюм нанёс сакрушальны ўдар народнаму фронту. Па яго ініцыятыве было ажыццёўлена «неўмяшанне» ў справы Іспаніі — гэта «трагічнае заблуджэнне, за якое іспанскі народ заплаціў сваёй кроўю», — як пісала аднойчы соцыялістычная партыя Іспаніі французскай соцыялістычнай партыі. Цяпер кожнаму ясна, што неўмяшанне было не «заблуджэннем», а добра прадуманым планам наступлення міжнароднай рэакцыі на рабочы клас і народны фронт у Іспаніі і ва Францыі.

Ажыццяўляючы «неўмяшанне», здраднік Блюм зрабіў самае вялікае злачынства за ўсю сваю багатую злачынствамі кар'еру. У якасці ўпаўнаважанага французскіх і англійскіх капіталістаў ён, ні мінуты не хістаючыся, адняў у іспанскага народа сродкі, якія дазволілі-б рэспубліканскай Іспаніі даць адпор здрадніцкаму мяцяжу генералаў і інтэрвенцыі.

Леон Блюм ведаў, што паражэнне рэспубліканскай Іспаніі прывядзе да паражэння народнага фронта і рабочага класа ва Францыі. Ён ведаў, што французскі народ хутка апыніцца перад жахамі імперыялістычнай вайны. Але іменна гэтага і хацелася дасягнуць Блюму і да яго падобным. Подлы Тарцюф спрабаваў апраўдаць смяротны прыгавор, вынесены ім сотням тысяч іспанскіх мужчын, жанчын і дзяцей, балбатнёй аб «неабходнасці захавання міру». Ён быў настолькі агідным у сваім прытворстве, што выклікаў прыступы млосці ў тых часных людзей, якія падчас былі вымушаны мець з ім справу. Гэты камедыянт рыдаў, праліваў слёзы, уздыхаў, а часам, здавалася, быў недалёк ад непрытомнасці.

Аднойчы Блюм прыняў у сваім раскошным кабінеце прадстаўнікоў іспанскага народнага фронта. Яны прышлі, каб прасіць яго зняць праклятую блакаду. Слова бярэ Пасіянарыя. Яна горача расказвае аб пакутах іспанскага народа, гаворыць аб волі да супраціўлення, праяўляемай бяззброннымі героямі, аб іх нечалавечай мужнасці. Яна адкрыта выказвае думку, што ў міністраў, і ў прыватнасці ў прэм'ер - міністра, адсутнічае пачуццё актыўнай салідарнасці з рэспубліканскай Іспаніяй, уласцівае французскаму народу і, у асаблівасці, цудоўнаму пролетарыяту Парыжа.

Пасіянарыя змаўкае. Блюм, апусціўшы галаву пад градам горкіх папрокаў Даларэс Ібаруры, падымаецца і падыходзіць да яе. З боку гледзячы, здаецца, што ён глыбока падаўлен. З яго грудзей вырываецца глыбокі ўздых. І, уздымаючы рукі к небу, ён усклікае:

— Якая пытка для мяне! Я разумею вас. Я згодзен з вамі. Але

**КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР:** (злева направа). **Іваноў Нікалай Сцяпанавіч** (выбарчая акруга № 351), **Багданская Тацяна Кузьмінічна** (выбарчая акруга № 330), **Шумскі Станіслаў Андрэевіч** (выбарчая акруга № 328), **Кардзіяка Іван Аляксеевіч** (выбарчая акруга № 340), **Смаржко Ніна Віктараўна** (выбарчая акруга № 380), **Вайцэшук Пётр Кірылавіч** (выбарчая акруга № 356).

# У ТУРМЕ

***(З біяграфіі кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР Сяргея Осіпавіча Прытыцкага)***

Гэта было летнім вечарам 1936 года. Наверка ўжо даўно прайшла. Сонца схавалася за блізкімі ўзгоркамі па другі бок ракі Віліі. У нашай камеры № 199 рабілася ўсё цямней. Жоўтыя сцены і дзверы сталі карычневымі. Турма жужжэла прыглушаным шумам соцень галасоў.

Раптам стук у сцяну. Мой таварыш прыціснуўся вухам. Літара за літарай па сістэме Марзе. Гавораць палітзняволеныя з другога паверху. Слоў было ўсяго некалькі: Сяргей прыгаворан да смяротнай кары. І зноў цішыня. У камеры стала цесна, як у каменным мяшку.

Мы кінуліся да сцяны суседняй камеры. Стукаем.

— Ведаеце ўжо?

— Так,—чуем адказ.

Ды хіба можна было чакаць чаго-небудзь іншага ад ашалелых і спалоханых паноў, іх суддзяў і пракурораў? Але ўсведамленне, што ён сядзіць унізе, у адзіночцы, а мы, яго таварышы, бяссільныя дапамагчы яму—давіла, клалася каменем на грудзі.

Сяргей сядзеў на самым нізе. у першай камеры скраю на правым крыле. Трымалі яго пры так званай «цэнтралцы», дзе пастаянна дзяжурылі турэмныя назорцы, каб лягчэй было наглядаць за кожным яго рухам. Туды яго перанеслі з турэмнай бальніцы нявылечанага пасля дзесятка ран ад куль палі-йскіх і шпікаў. Ён не мог яшчэ ...льна хадзіць і апіраўся на палку. ...траўнік пераварваў яшчэ дрэнна, ...е турэмныя садысты па загаду пракурора давалі яму нашу звычайную ежу, чорны хлеб з вотрубамі і гнілую бульбу. Трымалі яго ізаліравана ад іншых палітзняволеных, не дазвалялі атрымліваць ні газеты, ні пісьмовыя прылады. У яго камеры адзін вобыск ішоў за другім.

У гэту ноч мы не спалі. Думкі беглі ліхаманкава. Што рабіць? Што рабіць?

На наступны дзень увечары таварышы знізу зрабілі ўсё магчымае, каб звязацца з Сяргеем і перадаць яму некалькі слоў. Вяроўкі—«коні», як іх у нас называлі, што служылі нам для перадачы запісак і харчоў з камеры ў камеру праз акно, працавалі бесперапынна. Справа была цяжкая, бо трэба было кідаць іх наўскос. Але неймаверна цяжэй было што-небудзь напісаць і пераслаць Сяргею для нас. Нагляд над ім пасля смяротнага прыгавору стаў нясцерпна жорсткім.

Праходзілі напружаныя мінуты. Пісьмо ішло. На маленькім лістку паперы ўпэўненым почаркам чарнелі радкі, напісаныя алоўкам. Былі там словы, якія забыць нельга.

«Таварышы!.. Каты прыгаварылі мяне да смяротнай кары... Гэтага і трэба было чакаць. Такі жалезны закон класавай барацьбы... Цела маё яны могуць забіць,—але духу зламаць ім не ўдасца ніколі!..

Мы, комуністы, павінны даць прыклад не толькі таго, як трэба змагацца і перамагаць, але і як памерці!»

Так пісаў малады Сяргей Прытыцкі, прыгавораны да смяротнай кары за выстралы ў злейшага гада—правакатара Стрэльчука. З гэтых радкоў веяла такой сілай, такой мужнасцю, што ўсім нам стала лягчэй і гордасць перапоўніла сэрцы, што мы маем такога чалавека сярод нас.

На наступны дзень па рашэнню турэмнага камітэта мы адказалі на прыгавор галадоўкай пратэсту.

Прайшлі тыдні. На прагулку Сяргея вялі заўсёды асобна. Гуляў ён адзін пад стражай назорцы на малым двары. Мы толькі і чакалі яго паяўлення, і тады з дзесяткаў акенцаў, з-за кратаў, з усіх паверхаў, адкуль толькі відаць быў двор, узнімаліся сціснутыя кулакі, пасылаючы роднаму Сяргею брацкае прывітанне.

Многіх з нас перавялі на левае крыло, і тады мы час ад часу мелі магчымасць бачыць, як Сяргея вадзілі ў турэмную лазню. Ён заўсёды паварочваў галаву да нашых акенцаў, адкуль яго віталі ўзнятыя рукі і цёплыя словы. Ён глядзеў у наш бок і радасна ўсміхаўся.

Нам удалося адправіць пісьмо з турмы ад імені ўсіх палітзняволеных да шырокіх мас працоўных. Мы заклікалі змагацца ўсімі сіламі і сродкамі, каб выратаваць жыццё Сяргея. Мы глыбока ўзрадаваліся, калі атрымалі з волі друкаваныя рэволюцыйныя лістоўкі, прысвечаныя барацьбе за жыццё Прытыцкага. Мы неадкладна паведамілі аб гэтым яму самому. Падкрэслілі пры гэтым, што хваля пратэсту супроць гнуснага прыгавору над ім расце і ўзмацняецца.

5 снежня многіх з нас, у тым ліку і мяне, перавезлі ў турму ў Гродна. Сяргей астаўся ў Лукішках. І толькі ў Гродне мы даведаліся, што магутны рэволюцыйны пратэст працоўных многіх краін прымусіў панскі вярхоўны суд адмяніць смяротнае пакаранне, замяніўшы яго... пажыццёвым турэмным зняволеннем.

Але панам не ўдалося замучыць Сяргея ў турме. Распад памешчыцка-капіталістычнай Польшчы, знішчэнне панавання катаў, забойцаў і правакатараў выратавала яго жыццё, як і жыццё тысяч палітзняволеных, як жыццё ўсяго народа заходняй Беларусі.

Сяргей Прытыцкі, народны герой вызваленай Заходняй Беларусі, па дастоінству вылучан выбаршчыкамі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. Гэта сапраўдны прадстаўнік вызваленага беларускага народа. Усе выбаршчыкі, як адзін, аддадуць свае галасы за тав. Прытыцкага.

**С. Натансон.**

# ПАНСКІ ЯБЛЫК

***(АПАВЯДАННЕ)***

На занятках гуртка хатніх гаспадынь бабку Палагею папрасілі расказаць пра сваё жыццё. Агітатар Платон Сцяпанавіч зрабіў перад гэтым даклад аб тым, як жылося працоўнаму народу раней і чаго мы дабіліся зараз, у часы росквіту вялікай Сталінскай Канстытуцыі.

Бабка Палагея, хоць была па натуры і гаваркая, усё-ж аднеківалася.

— Ці-ж я патраплю расказаць вам, — просячыся, прагаварыла яна, калі ўсе падрыхтаваліся слухаць.

— Не скромнічайце, Палагея Іванаўна! — падбадзёрваў яе агітатар, дабрадушна ўсміхаючыся.

Бабка Палагея хвалявалася. Яна думала, з чаго-б ёй пачаць. Не ішло на язык першае слова. Памяць Палагеі не змяніла, і дома яна не раз апавядала пра сваё жыццё. Там гэта было проста і лёгка. А тут-жа будзе слухаць яе цэлы сход.

— Дзе вы нарадзіліся, Палагея Іванаўна, — дзе жылі ў маленстве? — запытаўся агітатар.

Бабка павесялела. Знайшлося першае слова.

— Нарадзілася, — хутка адказала бабка Палагея, — у маёнтку пана.. бадай яму калом зямля. Забылася, як зваць свайго першага пана. Шмат я іх ведала. Не ўпомніш усіх! Не то Цыбульскі, не то Яндульскі,—ды ліха з ім. Гэты быў печаны, як усе яны — паны. Паганы, як яго сабакі.

«Памятаю, было мне, каб не салгаць, год сем ці восем. Жылі мы зусім бедна. Андынары*) панскай ледзь да каляд хапала. А дзяцей нас многа было. Улетку карміліся чым папала. Тоўчаную кару з вадой елі, шчаўе, лебяду, асот варылі... Яблыкі, дык тыя ласункам былі для нас. Іх можна было перахапіць часамі каля плоту панскага саду: некалькі яблынь стаяла блізка ад плоту, і яблыкі, падаючы, траплялі на дзядзінец.

«Аднойчы ранічкай пабегла я ападкаў шукаць. Аглянулася сюд-туд — не відаць. Бачу: раса патоптана, ну, значыць, падабралі ўжо без мяне. Не адна-ж я ласавалася імі.

«Я ніяк не магу адарвацца ад гэтага месца. Тупаю, як навязаная. Прыглядаюся каля самага плоту. Плот быў з дошчак і не вельмі шчыльны. Раптам у адной шчыліне, амаль не паміж дошчак, убачыла спелы чырвоны яблык з салодкай яблыні. У мяне дух захапіла. Уся я затрэслася. Дастаць ці адыйсціся? Стаю, як зачараваная, вачэй не магу адарваць ад яблыка. А гэта-ж так лёгка дастаць яго! Варта толькі нагнуцца і працягнуць руку. «Вазьмі дурная! Ён-жа такі смачны, салодкі»,... здаецца шэпча мне нехта.

«Чым больш я стаяла і любавалася яблыкам, тым мацней мне хацелася дастаць яго. Я не думала ў гэты час ні пра старожа, ні пра эканома, ні нават пра самога пана.

«Як-жа мне быць? Асцярожна я нагінаюся. Нясмела пасоўваю руку да плоту, потым у шчыліну і — пальцы мае дакранаюцца яблыка! Сэрца як не выскачыць.

«Разачараваная, я выпускаю з рукі такую каштоўную здабычу!

«Не, я павінна дастаць яго!—Думаю сабе. Цяпер ужо, калі яблык быў у маёй руцэ, мне цяжка з ім разлучыцца.

«Я спрабую выгортваць яблык пальцамі. Гэта было нялёгка, і я шмат часу, мусіць, забавілася, але вось як праз сон чую панскі голас:

— Кусі, Палкан!

Я аглянулася. Куляючыся, як мядзведзь, проста на мяне наляцеў панскі Палкан, вялізны, злы сабака. Ад страху я нема крыкнула, а потым і нічога не памятаю.

«Казалі, што калі пан паклікаў сабаку, я сама не ўстала. Парабкі пазвалі бацьку, і ён забраў мяне поўмёртвую, пакусаную. Бацька не вытрымаў, нешта недалікатнае сказаў пану. За гэта пан выгнаў нас, і мы паехалі шукаць другога пана»...

Бабка Палагея спынілася, глянуўшы на агітатара. Хопіць ці яшчэ расказваць? Але ўсе дружна папрасілі бабку расказаць, як яна жыла потым. Цяпер, увайшоўшы ў ролю, бабка не аднеківалася. Яна расказала, як страціла ў 10 год матку, якой злой была яе мачыха і як, нарэшце, яна ўсё-ж вырасла вялікай і выйшла замуж за парабка. Як цяжка ёй было гадаваць дзяцей і як дажыла да таго, што яна, 70-гадовая бабуля, можа выбіраць у Вярхоўны Совет рэспублікі дэпутатаў і што яе перад людзьмі велічаюць Палагеяй Іванаўнай, як некалі паняў.

Расчулены агітатар шчыра паціснуў бабцы руку і сказаў:

— Я не памыліўся, Палагея Іванаўна! Вы — маеце што і ўмееце расказваць! Я спадзяюся, што вы не горш раскажаце ўсё гэта на раённым сходзе.

На гэты раз бабка Палагея не адмаўлялася.

**А. Якімовіч.**

*) Замест грошай паны плацілі сваім парабкам самым горшым збожжам і прадуктамі; такая плата называлася андынарыяй.

---

я не магу дзейнічаць інакш!

І гнусны камедыянт халоднакроўна і без жалю сочыць за тым, каб блакада праводзілася з жорсткай суровасцю.

Пакуль прадаўжалася вайна ў Іспаніі, Блюм не спыняў плесці інтрыгі ў кругах іспанскіх соцыялістычных лідэраў, імкнучыся дамовіцца з Кабальеро, Прыето, Бестэйро і іншымі наконт кампраміса з Франко і раскола народнага фронта.

У якасці агента капіталістычнай Англіі Блюм быў прамым натхніцелем Касадо і другіх здраднікаў, якія нанеслі ўдар у спіну гераічным абаронцам Мадрыда і выдалі іх забойцам-франкістам.

Леона Блюма, як ледзі Макбет, павінны праследваць цені яго шматлікіх афяр. Кроў нявінных пакрывае яго рукі і даўгія кастлявыя пальцы.

## ЯК БЫЎ РАСЧЫШЧАН ШЛЯХ РЭАКЦЫІ І ВАЙНЫ

У лютым 1937 года прэм'ер-міністр Блюм аб'явіў «перадышку». Ён заявіў, што трэба «перадыхнуць» і «пераварыць» рэформы народнага фронта. Адзінымі дасягненнямі рабочага класа былі тыя, якія ён дабіўся ў 1936 годзе: 40-гадзінны працоўны тыдзень, аплачаны водпуск, калектыўныя дагаворы. Калі дэлегаты Ўсеагульнай канфедэрацыі працы наведалі Блюма ў чэрвені 1936 года, ён сказаў ім:

— Добра, я падтрымаю вашы законапраекты ў кастрычніку.

Комуніст Франшон, адзін з кіраўнікоў Усеагульнай канфедэрацыі працы, адказаў:

— Зараз-жа, на працягу 48 гадзін, яны павінны быць прыняты парламентам.

Пад націскам мас Блюму прышлося згадзіцца. Але ў лістападзе 1936 года Блюм прадпрыняў першае абясцэньванне франка, выклікаўшае ўздаражэнне жыцця і амаль знішчыўшае тое павышэнне зарплаты, якога дабіліся рабочыя. Тым часам старыкі прадаўжалі чакаць пенсіі, беспрацоўныя — работы, паштовыя служачыя — 40-гадзіннага працоўнага тыдня, моладзь — арганізацыі вучнёўства, сяляне — касы дапамогі, правядзення буйнага дарожнага будаўніцтва, абваднення і электрыфікацыі. Але пад прадлогам «перадышкі» Блюм рашыў адкрыта адыйсці ад праграмы народнага фронта.

Член палаты дэпутатаў і мракабес Ібарнегарэ заявіў — і гэта заява была пацверджана ў «Журналь офісіель», — што Леон Блюм аблягчыў аднаўленне падрыўных атрадаў рэакцыі —«баявых крыжоў».

У ліпені 1937 года Блюм пакінуў пост прэм'ера, хоць палата дэпутатаў не выказалася супроць урада. Прадлогам для свайго ўходу ён выбраў парламенцкія затрудненні, з якімі яму прышлося сутыкнуцца. Комуністы прапанавалі Блюму і соцыялістычнай партыі не паддавацца націску рэакцыі, арганізаваць супрацоўленне мас, правесці дзейснае выступленне супроць рэакцыі ў парламенце і па-за яго сцен.

Але Блюму ўдалося запрацівіцца прапанове комуністаў. Пазней ён растлумачыў на старонках «Попюлер», што падобная барацьба немінуча «пашырылася-б па ўсёй краіне і знайшла-б выражэнне ў сур'ёзных і бесперапынна нарастаючых народных выступленнях». Гэтага не хацелі дапусціць ні Блюм, ні буржуазія.

У верасні 1939 года Леон Блюм аб'явіў сябе староннікам «палітыкі Мюнхена». Цяпер увесь свет бачыць, што ў Мюнхене англійскія і французскія рэакцыянеры плялі подлы загавор супроць Совецкага Саюза і ўсеагульнага міру. Надзвычайныя дэкрэты ўрада Даладзье звялі на нішто ўсе заваёвы народнага фронта. Усеагульная забастоўка 30 лістапада 1938 года была здраджана Блюмам і Жуо і жорстка падаўлена іх саратнікам Даладзье. Затым паследваў знішчаючы, сакрушальны ўдар па Іспанскай рэспубліцы; ва Францыі былі арганізаваны ганебныя канцэнтрацыйныя лагеры, куды, падобна злачынцам, засадзілі герояў іспанскай народнай арміі і адважных байцоў інтэрнацыянальных брыгад. Капіталісты перайшлі ў генеральнае наступленне на рабочы клас і ўсіх працоўных Францыі.

Так была падрыхтавана імперыялістычная вайна.

## МАСКА СКІНУТА

У дні вайны Блюм перастаў выкручвацца, як агідны гад. Цяпер ён даў волю сваім дзікім інстынктам буржуа - эксплаатататара, які спалохаўся было за свае прывілегіі. Ён больш не стараецца скрываць сапраўдны сэнс сваёй палітыкі, цалкам накіраванай на абарону інтарэсаў капітала. Нібы ланцужны пёс, кідаецца ён на рабочы клас, на комуністаў, на Совецкі Саюз.

Компартыя кляйміць несправядлівы, рэакцыйны, імперыялістычны характар сучаснай вайны. Яна заклікае ўсіх працоўных на барацьбу супроць рэакцыі ва Францыі, на барацьбу за неадкладны мір. Яна стойка абараняе патрабаванні ўсіх працоўных. З захапленнем папулярызуе яна цвёрдую палітыку міру краіны Советаў, якую імперыялістычныя падпальшчыкі пры ўсім жаданні не змаглі ўцягнуць у вір вялікай вайны.

Рэакцыя прыходзіць у ярасць ад паслядоўнай і рашучай барацьбы компартыі супроць імперыялістычнай вайны. Рэакцыянеры вядуць паход супроць рабочага класа і яго партыі. Шакал Леон Блюм узначальвае зграю, якая брэша на комунізм і Совецкі Саюз.

Даладзье і міністр унутраных спраў Саро даставілі нямалую асалоду Блюму, забараніўшы «Юманітэ».

Нікчэмны нягоднік прама пусціўся ў пляс ад радасці. Ён прад'явіў комуністычным дэпутатам зневажальныя і бессаромныя патрабаванні. Блюм спрабаваў угаварыць іх адмовіцца ад сваёй партыі і свайго інтэрнацыянала, здрадзіць Совецкаму Саюзу і інтарэсам рабочага класа, пагражаючы ім у выпадку адмовы ваенным судом. Блюм прапанаваў ураду «аддаць комуністычных дэпутатаў суду, прыгаварыць і пакараць іх».

Урад забараніў комуністычную партыю. Гэта забарона была спраЬацыравана і падрыхтавана Блюмам і яго саўдзельнікам Жуо, другім здраднікам.

«Попюлер» публікуе паліцэйскія адчоты аб масавых арыштах комуністаў, нібы пераможныя рэляцыі. Газета соцыялістычнай партыі з задавальненнем паведамляе аб 5—6-гадовых турэмных прыгаворах, якія выносяць барацьбітам за мір. З цынічнай усмешкай выражае яна радасць па поваду таго, што тысячы комуністычных рабочых «валяюцца на сырой саломе ў турмах».

Французская буржуазія вядзе бязлітасную вайну супроць рабочага класа. І Блюм выступае супроць патрабуемага рабочымі павышэння зарплаты. Якая яму справа да пакут працоўных? Для яго існуюць толькі ваенныя мэты імперыялістычнай буржуазіі!

## ТВАР АШАЛЕЎШАГА ПАДПАЛЬШЧЫКА ВАЙНЫ

Падпальшчык вайны Блюм імкнецца пераканаць масы, быццам капіталістычная Францыя ўзялася з бяспрыкладнай бескарыснасцю за зброю толькі таму, што рашыла захаваць «вернасць сваім абавязацельствам адносна Польшчы». Блюм пацвярджае, што Францыя хоча «выратаваць сучасную цывілізацыю, якая аснавана на натуральных правах асобы, дзяржаўна - буржуазных свабодах і справядлівасці ў адносінах да індывідуумаў і народаў». Якое агіднае прытворства, які наглы цынізм крыецца ў гэтых словах машэнніка, прыдумаўшага «неўмяшанне», труслівага абаронца «палітыкі Мюнхена», прадстаўніка той прагнай да нажывы буржуазіі, якая прыгнечвае 70 мільёнаў каланіяльных рабоў!

Каго хоча ўвесці ў заблуджэнне правакатар Блюм, запэўніваючы, што сучасная Францыя з'яўляецца «краінай свабоды»? 10 тысяч французскіх працоўных сядзяць у турмах ці канцэнтрацыйных лагерах; у канцлагерах томяцца іспанскія бежанцы і дабравольцы інтэрнацыянальных брыгад; Даладзье зноў увёў каралеўскія «летр дэ кашэ»; друку затыкаюць рот; парламент на ланцугу, а верныя народу дэпутаты кінуты ў турмы!

У сваіх нападках на Совецкі Саюз, у паклёпе на большэвіцкую партыю і на Сталіна, гэтага гіганта рэволюцыйнай мыслі, Блюм пераўзыходзіць самога сябе. Ён адлюстроўвае ярасць і расчараванне правакатараў вайны, якім не ўдалося ўцягнуць Совецкі Саюз у заходне-еўрапейскі канфлікт.

І вось Блюм, ярасць якога расце з кожным днём, пачаў адкрыта прапаведваць крыжавы паход супроць Совецкага Саюза. Але французскія працоўныя не дапусцяць вайны супроць Совецкага Саюза. А ў крайнім выпадку яны паследуюць прыкладу Андрэ Марці і матросаў чорнаморскай эскадры французскага флота.

Гісторыя міжнароднага рабочага руху ведае многа выдатных вобразаў рэволюцыйных барацьбітоў, мужных і цвёрдых абаронцаў вялікай справы соцыялізма. Але яна ведае і гнусных здраднікаў, выклікаючых да сябе агіду ва ўсіх працоўных. Мільеран, Пілсудскі, Носке, Троцкі былі кожны ў свой час выкінуты за борт рабочага руху. Блюм злучае ў сабе страх Мільерана перад соцыялізмам, жорсткасць Пілсудскага, трусасць крывавага пса Носке і нянавісць бандыта Троцкага да Совецкага Саюза.

Рабочы клас прыгвоздзіць да ганебнага слупа Леона Блюма, аўтара палітыкі «неўмяшання», Блюма—паліцэйскага сышчыка, Блюма—падпальшчыка вайны. Гэта неабходная прадпасылка пераможнай барацьбы за мір, за соцыялізм.

Францыя, люты 1940 г.

«Комсамольская правда».

# ЗА РУБЯЖОМ

## ПРАЦЭС ФРАНЦУЗСКІХ ДЭПУТАТАЎ-КОМУНІСТАЎ

БРУСЕЛЬ, 21 сакавіка. (ТАСС). 20 сакавіка ў парыжскім ваенным трыбунале пачаўся працэс французскіх дэпутатаў-комуністаў. На лаве падсудных 35 незаконна пазбаўленых дэпутацкіх правоў дэпутатаў парламента — Бійу, Бонт, Жан Рэно, Мідоль, Костэ і інш. Вакол будынка і ў зале суда, — шматлікія паліцэйскія нарады.

У пачатку судовага пасяджэння выступіў прадстаўнік абароны Зеваэс. Ён заявіў, што, як яму стала вядома, членам урада забаронена выступаць у якасці сведак. Зеваэс патрэбаваў, каб трыбунал не лічыўся з рашэннем урада і выклікаў у якасці сведак міністраў Кэй, Далад'е і Бонэ.

Гэта патрэбаванне абароны выклікала спрэчку паміж пракурорам і трыбуналам, з аднаго боку, абаронай і падсуднымі — з другога.

Абаронца Вілар указвае, што Далад'е аб'явіў дэпутатаў комуністаў здраднікамі. Між тым, седзячыя на лаве падсудных заўсёды былі самымі паслядоўнымі абаронцамі інтарэсаў большасці французскага народа. «На лаве падсудных, — гаворыць абаронца, — знаходзяцца 35 народных выбраннікаў, якіх народ ніколі яшчэ не пазбаўляў свайго давер'я. Няхай Далад'е перад судом дакажа сваё страшэннае абвінавачанне па адрасу комуністаў.

Пракурор супярэчыў супроць патрабавання абароны. Трыбунал пасля гадзіннай нарады адхіляе патрабаванне Зеваэса і Вілара.

Пры пераклічцы абвінавачваемых Барэль, Бійу, Жан Рэно, Мідоль і большасць іншых на пытанне аб прафесіі адказваюць: «Дэпутат, пазбаўлены мандата», «Дэпутат, выбраны рабочымі і сялянамі Францыі».

Старшыня трыбунала спачатку прабаваў забараніць абвінавачваемым даваць такія адказы, але затым быў вымушан прымірыцца. Бонт і Бійу дадаюць, калі чарга даходзіць да іх, што выбаршчыкі не пазбаўлялі іх дэпутацкіх мандатаў. У сувязі з гэтым старшыня пагражае Бонту ўдаленнем з працэса.

Затым абвінавачваемым прадастаўляецца слова для заяў. Яны патрабуюць, каб Далад'е і Бонэ з'явіліся ў суд і даказалі абвінавачанні, кінутыя імі па адрасу дэпутатаў-комуністаў. Яркую палітычную прамову сказаў Бонт.

Пасля мінутнага перапынку трыбунал зноў адхіляе прапанову аб выкліку Далад'е і Бонэ у суд.

У канцы пасяджэння пракурор патрэбаваў, каб у далейшым працэс адбываўся пры зачыненых дзвярах. Абаронцы і абвінавачваемыя рэзка пратэставалі супроць гэтага. Пасля нарады трыбунал рашыў весці працэс пры зачыненых дзвярах.

—о—

## РАЗГУЛ РЭАКЦЫІ ВА ФРАНЦЫІ

БРУСЕЛЬ, 21 сакавіка. (ТАСС). Газета «Матэн» паведамляе аб працягванні праследванняў комуністаў ва Францыі. Так, у горазе П'ер дэ Корп было арыштавана чатыры чалавекі. У горадзе Вільжуіф арыштавана пяць чалавек. Далей газета ўказвае, што ў дэпартаменце Сены было арыштавана 6 чалавек за распаўсюджванне антываенных лістовак. Зроблены арышты ў сувязі з аднаўленнем забароненых арганізацый у Монбельяр. Усяго арыштавана 33 чалавекі.

Па паведамленнях той-жа газеты, у Руане арыштавана 12 комуністаў-актывістаў, былых рабочых ваеннага арсенала. Сярод арыштаваных — кіраўнік профсаюза Руана.

## АБВЯРЖЭННЕ АФГАНІСТАНСКАЙ ГАЗЕТЫ

КАБУЛ, 21 сакавіка. (ТАСС). У газеце «Іслах» апублікавана наступнае абвяржэнне з прычыны нібыта існуючай пагрозы Афганістану з боку СССР. «У апошні час некаторыя замежныя газеты распаўсюджваюць весткі і публікуюць артыкулы адносна быццам існуючай пагрозы нападу СССР на Афганістан і аб ваеннай падрыхтоўцы Афганістана. У прыватнасці егіпецкія газеты больш за іншыя змяшчаюць такія весткі. Так, егіпецкі журнал «Аль хіляль» у нумары ад 26 лютага змясціў паведамленне аб падрыхтоўцы Афганістана да вайны і яго ваенных мерапрыемствах. Як і раней, мы абвяргаем гэтыя паведамленні і лічым іх несапраўднымі. Адначасова мы не можам устрымацца ад здзіўлення—чаму ўпамянутыя газеты змяшчаюць такія неабгрунтаваныя весткі. Мы просім рэдактараў егіпецкіх газет устрымлівацца ад змяшчэння хлуслівых звестак».

Тая-ж газета «Іслах» яшчэ раз адзначае: «Паміж Афганістанам і яго суседзямі існуюць прыязныя і добрасуседскія адносіны. У самым пачатку ўзнікнення вайны Афганістан аб'явіў аб захаванні нейтралітэта. Для Афганістана не існуе якой-небудзь небяспекі, якая выклікала-б неабходнасць прыняць надзвычайныя меры».

## Выступленне Чэмберлена

ЛОНДАН, 21 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ў палаце абшчын выступіў прэм'ер Чемберлен з прамовай, прысвечанай галоўным чынам совецка-фінляндскаму мірнаму дагавору. Як відаць са зместу ўсёй прамовы, яе прызначэннем было даказаць, што з боку Англіі і Францыі былі праяўлены вялікія намаганні ў справе дапамогі Фінляндыі і што калі гэтыя намаганні не далі чакаемых імі рэзультатаў, то нібыта ў гэтым галоўным чынам вінаваты Швецыя і Нарвегія, якія адмовіліся прапусціць англа-французскія войскі праз сваю тэрыторыю. Чэмберлен пералічыў ваенныя матэрыялы, якія былі пасланы Англіяй у Фінляндыю. Чэмберлен узмоцнена нападаў на Германію, якая нібыта аказала націск на Швецыю і Нарвегію па пытанню аб пропуску войск.

У той-жа час прамова Чэмберлена змяшчала неаднаразовыя папрокі па адрасу Швецыі і Нарвегіі. У прыватнасці Чэмберлен крытычна адазваўся аб «дактрыне нейтралітэта», якая быццам паралізавала дзеянні Нарвегіі і Швецыі і якая «была аснована на дапушчэнні, што для малой нейтральнай краіны лепш перажыць усё што ўгодна, абы толькі не аказацца ўцягнутай у вайну паміж Германіяй і саюзнікамі». Чэмберлен рэкамандаваў Швецыі і Нарвегіі парваць з гэтай «дактрынай нейтралітэта» і «далучыцца да іншых краін» (гутарка ідзе аб Англіі і Францыі), якія гатовы ім дапамагчы.

Закрануўшы паездку Уэлеса і сустрэчы ў Брэнеры Гітлера і Мусаліні, Чэмберлан сказаў: «Якім-бы ні аказаўся выхад гэтай сустрэчы, мы да яго гатовы і не адхілімся ад той мэты, для якой мы ўступілі ў гэту вайну».

Далей Чэмберлен паведаміў, што ў час апошняго налёту германскай авіяцыі на Скапа-Флоу было скінута каля 20 бомб. Адзін карабль атрымаў пашкоджанні. Германскія самалёты скінулі на сушу ў раёне Скапа-Флоў 121 бомбу вялікай разбуральнай сілы і каля 500 запальваючых бомб.

Датыкаючыся перспектыў вайны, Чэмберлен у заключэнне сказаў: «Той-сёй будзе настайваць на больш рашучай палітыцы. Мы ўсведамляем усю адказнасць, якая кладзецца на ўрад, і нас не штурхнуць на авантуру, якая, па нашай думцы, мае мала шансаў на поспех і можа стварыць небяспеку, а можа быць прывесці да катастрофы. Пытанне аб часе і месцы, калі мы зможам нанесці ўдар, павінна быць вырашана на аснове самых прадуманых рашэнняў».

## Новы састаў французскага ўрада

ПАРЫЖ, 21 сакавіка. (ТАСС). Поль Рэйно сфарміраваў новы кабінет у наступным саставе: старшыня совета міністраў і міністр замежных спраў Рэйно («альянс дэмакратык»), намеснік старшыні совета міністраў Шатан (радыкал-соцыяліст), ваенны міністр Далад'е (радыкал-соцыяліст), міністр юстыцыі Сероль (соцыяліст), міністр унутраных спраў Руа (радыкал-соцыяліст), міністр фінансаў Ламурэ (радыкал-соцыяліст), міністр інфармацыі Фрасар («соцыялістычны і рэспубліканскі саюз»), марскі міністр Кампінкі (радыкал-соцыяліст), міністр авіяцыі Ларан-Эйнак («радыкальная левая»), міністр асветы Саро (радыкал-соцыяліст), міністр калоній Мандэль (незалежны рэспубліканец), міністр гандлю і прамысловасці Ралэн («альянс дэмакратык»), міністр грамадскіх работ і транспарта дэ Мондзі («соцыяліст. і рэсп. саюз»), міністр працы Памарэ («соцыяліст. і рэсп. саюз»), міністр сувязі Жульен (радыкал-соцыяліст), міністр гандлёвага флота Рыо (левы дэмакрат), міністр снабжэння Кэй (радыкал-соцыяліст), міністр земляробства Тэльe («альянс дэмакратык»), міністр узбраенняў Датры (па-за групіровак), міністр аховы здароўя Эро («альянс дэмакратык»), міністр пенсій Рыв'ер (соцыяліст), міністр блакады Монэ (соцыяліст).

## ВАЙНА Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

БЕРЛІН, 21 сакавіка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе: «На заходнім фронце паміж Мозелем і Пфальцскім лесам моцная артылерыйская і разведчая дзейнасць. Германскія самалёты 20 сакавіка ўвечары ўчынілі налёт на караван суднаў, які ішоў пад канвоем англійскага крэйсера і эсмінца. Караван быў рассеян. Патоплена 9 ваенных і гандлёвых суднаў агульным вадазмяшчэннем каля 42.000 тон. Акрамя таго, прычынены цяжкія пашкоджанні двум гандлёвым параходам. У паветраным баі збіт самалёт праціўніка.

Германская авіяцыя страціла адзін самалёт. У той-жа дзень у раёне на ўсход ад Фрызскіх астравоў былі заўважаны англійскія разведчыя самалёты. Яны былі абстрэлены германскай проціпаветранай абаронай. Пры налёце англійскіх самалётаў у ноч на 20 сакавіка на востраў Зільт збіта тры англійскіх самалёты».

## ШВЕДСКАЯ РЭАКЦЫЯ НЕ ЎНІМАЕЦЦА

СТАКГОЛЬМ, 21 сакавіка. (ТАСС). Совецка-фінляндскі мірны дагавор нанёс сур'ёзнае паражэнне планам падпальшчыкаў вайны на поўначы Еўропы. Выконваючы волю сваіх гаспадароў, шведская рэакцыя неадкладна пасля заключэння совецка-фінляндскага мірнага дагавора разгарнула новую шалёную кампанію, накіраваную на падрыў нейтралітэта Скандынавіі. На гэты раз сцягам, вакол якога аб'ядналіся ўсе сілы скандынаўскай рэакцыі, стаў так званы «абарончы саюз» Швецыі, Нарвегіі і Фінляндыі. Сваю кампанію шведскія рэакцыянеры праводзяць пад лозунгам «перагляду саміх асноў усёй шведскай і нарвежскай палітыкі», гэта значыць адмаўлення ад палітыкі нейтралітэта.

Дастаткова звярнуцца да «крыніц» плана стварэння гэтага «абарончага саюза», каб пераканацца, што ў гэтай «ідэі» няма нічога новага. Тыя-ж самыя сілы, якія правацыравалі скандынаўскія краіны на вайну, працягваюць дзейнічаць у тым-жа напрамку, прапаведуючы так званы «абарончы саюз». «Тыя, хто стараўся расшырыць вайну, — піша нарвежская газета «Арбайдэрэн», — з'яўляюцца цяпер найбольш агрэсіўнымі абаронцамі заключэння абарончага саюза. Яны не утойваюць, што гэты саюз накіраван супроць СССР».

Толькі днямі ў Стакгольме ў самым вялікім зале «Аудыторыум» адбыўся мітынг, на якім выступілі лідэры «актывісцкага» руху ў Швецыі — небезвядомы Хеглунд, генерал Окерман і іншыя. У той час, як Хеглунд «абгрунтоўваў» неабходнасць стварэння «абарончага саюза» з палітычнага пункту гледжання, прадстаўнікі рэакцыйнай часткі шведскай ваеншчыны спыніліся на ваеннай старане пытання.

У сваёй гнуснай, поўнай антысовецкіх выпадаў прамове Хеглунд усяляк умудраўся ў доказах неабходнасці пакончыць з нейтралітэтам Швецыі.

На гэтым мітынгу адбылося своеасаблівае братанне паміж рэакцыйнай часткай ваеншчыны і групай Хеглунда. Бравы генерал Окерман пры ўзнятым тоне ўздаваў належнае правакатару Хеглунду, горда заявіўшы, што «яго стары праціўнік стаіць побач з ім на адной трыбуне і сімвалізуе ідэю адзінства перад агульнай небяспекай».

Яркае святло на ўсю шуміху, узнятую вакол «абарончага саюза», пралівае той факт, што ў якасці аднаго з «праграмных» дакументаў, абгрунтоўваючых «неабходнасць» гэтага саюза, фігурыруе кніжачка генерал-майора Юнга, зараз начальніка генеральнага штаба шведскай арміі, выданая ў 1930 годзе. У гэтай кніжачцы Юнг яшчэ ў 1930 годзе сфармуліраваў «праграму» аб'еднання паўночных краін у мэтах барацьбы супроць Совецкага Саюза.

Аднак уся гэта свістапляска «актывістаў» выклікае пратэсты мас і сур'ёзныя супярэчанні асоб, зацікаўленых захаваннем міру і нейтралітэта Швецыі. Днямі шведскі міністр шляхоў зносін ліберал Андэрсон у сваёй прамове ў горадзе Мура заявіў, што актывісцкі друк не адлюстроўвае сапраўдных настрояў шведскай грамадскасці. «Тое, што прапаведвалася ў апошнія дні ў друку, — заявіў ён, — не з'яўляецца паказаннем. Нельга сказаць, што газеты адлюстроўваюць грамадскую думку нават у тым выпадку, калі яны стараюцца зрабіць уплыў на яе».

У радзе газет таксама выказваюцца пратэсты супроць правакацыйнай лініі падпальшчыкаў вайны.



На здымку: Дзеці на тэрасе 1-й дзіцячай бальніцы ў г. Беластоку.
(Фота-клішэ ТАСС).

## КІНО

## „НАСТАЎНІК“

Педагог па прафесіі, Сяргей Герасімаў напісаў высокамастацкі і глыбока праўдзівы сцэнарый кінофільма «Настаўнік». Ролю настаўніка Сцяпана Лауціна іграе заслужаны артыст рэспублікі, ордэнаносец Барыс Чыркоў. Яго ведае совецкі глядач па незабыўнаму вобразу Максіма. Чыркова ведаюць і беластачане па яго асабістаму нядаўняму наведванню горада Беластока.

Проста, як у сапраўдным жыцці, у совецкай рэчаіснасці, адбываюцца захапляючыя дзеі ў фільме. Сцяпан Лауцін, сын селяніна- калгасніка, старога партызана, скончыў маскоўскі педагагічны інстытут і прыехаў у роднае сяло Марынскае. Мы бачым чуллівую сустрэчу, высокае пачуццё роднасці ў сына і бацькоўскую строгасць да яго далейшай работы і будучыні. Скончыўшы інстытут, Сцяпан рашыў працаваць у родным сяле, каб наладзіць справы ў школе. На гэтай глебе — бацькава непрыязнь. Бо суседскі сын Худзякоў, равеснік Сцяпана, стаў ужо камбрыгам авіяцыі, а Сцяпан задумаў астацца ў сяле настаўнікам. Не такога сына чакаў стары партызан, зараз старшыня калгаса, узнагароджаны ордэнам. Ён хацеў сына — героя, аб якім-бы гаварыў народ, каб ён узвышаў слаўную фамілію Лауціных.

У фільме мы бачым высокія ідэалы народнага настаўніка, яго растучы грамадскі аўтарытэт, які прымушае бацьку змякчыцца, згадзіцца. Аднасяльчане шчыра паважаюць земляка-настаўніка. А маладая дзяўчына Груня закахалася ў Сцяпана і балюча ўспрымае перапіску яго з былой студэнткай. Але Сцяпан таксама любіць Груню. І мы бачым глыбокія перажыванні гэтых людзей, поўныя чыстага лірызма і гарачай шчырасці.

У раёне заўважылі выдатныя справы маладога настаўніка. Пры садзейнасці сакратара райкома партыі скора ў сяле пабудавалі новую дзесяцігодку. Дырэктар яе—Сцяпан Лауцін. Разгортваецца цікавейшы эпізод прыёму экзаменаў, і першай іх здае Груня. Якраз у час экзаменаў у сяло прыляцеў самалёт. Гэта прыляцеў той самы камбрыг Худзякоў, перад якім прыніжаў свайго сына старшыня калгаса Іван Фёдаравіч Лауцін. Гарачая сустрэча з слаўным земляком. Мітынг. А на мітынгу камбрыг паведамляе радасную вестку: яго часць вылучыла кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета скромнага сельскага настаўніка Сцяпана Фёдаравіча Лаўціна.

Мы бачым наступіўшы паварот адносін бацькі да сына. Мы бачым узмацненне агульнай павагі, аўтарытэту да настаўніка. І ўжо якраз тады, калі Груня сабралася ехаць у Маскву, Сцяпан дабіўся ад яе канчатковага рашэння. Радасцю сваёй ён хоча падзяліцца з Худзяковым, але той прытварыўся спячым. Тады шчаслівы закаханы выбег з сваёй радасцю насустрач узыходзячаму сонцу, якое абяцала ясны дзень новага жыцця. Два высокіх шчасці адразу прышлі да скромнага настаўніка. Народ намеціў яго сваім выбраннікам у Вярхоўны орган совецкай улады. Любімая дзяўчына прызнала ў ім выбранніка свайго чыстага гарачага сэрца.

Некаторыя ісціны гэтага фільма, ісціны нашага жыцця, так выдатна паказаныя на экране, трэба падкрэсліць асобна. Сын селяніна скончыў педагагічны інстытут. Сялянская дзяўчына Груня Шуміліна (ролю яе так роўна і прыемна іграе артыстка - ордэнаноска Тамара Макарава) скончыла дзесяцігодку ў сяле і сабралася ехаць у сталіцу вучыцца: гэта ёй даступна. Сялянскі сын Худзякоў (артыст Н. Сунозаў)—стаў камбрыгам. Сялянскія дзеці, якія пагалоўна вучацца, з заміраннем сэрца слухаюць апавяданне Чэхава аб трагічнай долі майстровага хлопчыка Вані Жукава, што было звычайным, абыдзённым у былой царскай Расіі, як і ў былой панскай Польшчы. Чэснай працай на фронце народнай асветы, настаўнік заслужыў знатнасць і высокае давер'е народа, які выбраў яго сваім дэпутатам. І любы, хто чэсна аддае свае сілы і веды народу, мае шчасце быць любімцам і выбраннікам народу.

Гэты фільм асабліва цікава гля... зараз, калі ў вызваленых заходні... ласцях народ вылучае кандыдат... дэпутаты Вярхоўных органаў со... лістычнай дзяржавы: простых, чэс... самаадданых, верных людзей.

І. Клінаў.

—«о»—

# ПА БЕЛАСТОКУ І ОБЛАСЦІ

## ШАХМАТНЫ ТУРНІР У ЧЭСЦЬ 24 САКАВІКА

У чэсць выбараў з 9 сакавіка ў памяшканні шахматнага клуба пачаўся шахматны турнір на пяршынства г. Беластока. У турніры прымаюць удзел 23 лепшых шахматысты горада. Ужо адбылося 6 тураў. Уперадзе ідуць тт. Барын (6 ачкоў), Клементыноўскі (5 ачкоў), Яновіч (4). Нядрэнна іграюць шахматысты - школьнікі Зыберскі і Слуоўскі. Турнір выклікаў вялікую цікавасць сярод шахматыстаў.

## МУЗЫКАЛЬНАЯ ШКОЛА Ў ГРОДНА

У Гродна адкрылася музыкальная школа з дашкольным аддзяленнем. Назіраецца вялікі наплыў жадаючых паступіць у школу. На 150 месц падана 1.200 заяў. Ствараюцца класы фартэпіяна, скрыпкі, віяланчэлі, духавых і народных інструментаў.

24 сакавіка — у дзень выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР выхаванцы школы і выкладчыкі дадуць канцэрты на выбарчых участках.

## СПЕКУЛЯНТЫ

За апошнія дні аддзел па барацьбе са спекуляцыяй Беластоцкай абласной міліцыі выкрыў некалькі груп буйных спекулянтаў, якія закрылі свае магазіны і прадавалі тавары па спекулятыўных цэнах.

Так, Бышковіч Эстэр мела магазін дамскага абсталявання. З прыходам Чырвонай Арміі Бышковіч закрыла свой магазін і займалася гандлем золата, плаціны і іншых каштоўнасцей. У час вобыску ў Бышковіч адабрана тавараў на 400 тысяч рублёў.

У гандляркі Калінай знойдзена 1.068 метраў сукна і шоўку, 136 пар шоўкавых парыжскіх панчох, гатовай вопраткі і інш. тавараў, якія яна прадавала па спекулятыўных цэнах.

Былы ўтрымальнік рэстарана Танчэўскі займаўся спекуляцыяй гарэлкі, якой у яго знайшлі 1.000 літраў.

За апошнія дні выкрыта таксама група спекулянтаў, якія займаліся скупкай валюты. У арыштаваных валютчыкаў Ракавер Якуба, Галакоўскага Абрама і інш. адабрана 42.560 рублёў совецкіх грашовых знакаў, 173.000 польскіх злотых, 116 амерыканскіх долараў, многа нямецкіх марак і частка золата царскай чаканкі.

У інжынера Дубаноўскага, які займаўся таксама спекуляцыяй валюты, адабрана 15 тысяч рублёў совецкімі грашыма, 8 тысяч польскіх злотых, 20 амерыканскіх долараў і частка золата царскай чаканкі.

Усе пералічаныя спекулянты арыштаваны і па сканчэнні следства будуць перададзены суду.

Н. Б.




Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара — 22 (па камутатару аблвыканкома) і 49 (гарадскі), сакратарыята, партыйнага і совецкага аддзелаў — 23 (па камутатару аблвыканкома), прамысловага, сельскагаспадарчага, культурнага і інфармацыйнага аддзелаў — 17-62 (гарадскі). Тэлефон выдавецтва і аддзела аб'яў — 16-10. Тэлефон друкарні і начной рэдакцыі — 5-21.
Падпіску на газеты прымае «Саюздрук» (Тэлефон 5-14).

Упаўнаважаны абліта № 413.
1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.